Studia Interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej 19
ISSN 1898-4215; e-ISSN 2544-3143
Copyright © by Anatol Vialiki 2026
Creative Commons: Uznanie Autorstwa 4.0 (CC BY 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/
https://doi.org/10.31338/2544-3143.si.2026-19.6

Anatol Vialiki
Polska Akademia Nauk
akoidanov@yahoo.com
ORCID: 0000-0001-7160-6366

„БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМ І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫЗМ": ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАГА РУХУ Ў БССР. 1928–1938 ГГ.[1]

"Belarusian National Democracy and National Fascism": The Falsification of the Belarusian National-Democratic Movement in the BSSR, 1928–1938

Abstract

Towards the end of the 1920s, the Party and the Soviet leadership of Soviet Belarus launched an uncompromising struggle against "national democracy" in the Belarusian SSR and "national fascism" in western Belarus. The political terror waged by the OGPU (United Political Directorate) against the national-democratic intelligentsia in the BSSR led to the fabrication of trials against the so-called "Union for the Liberation of Belarus" (SWB, 1930) and the "Belarusian National Centre" (BNC, 1933), resulting in the repres-

[1] Artykuł został opracowany w ramach grantu NPRH/F/SP/0077/2024/13 „Między nauką a polityką: ośrodki badające problematykę polską w Związku Sowieckim w latach 1921–1938".

sion of many activists within the national-democratic movement. In Western Belarus, political parties and activists of the national-democratic movement were treated as "national fascists", against whom a large-scale propaganda campaign was waged both in the BSSR and in Western Belarus.

Keywords: Belarusian National Democratic Movement, BSSR, Belarusian "national fascism", Soviet repression

У пачатку XX стагоддзя ў Еўропе ў грамадска-палітычным жыцці ўзнік і хутка пашырыўся фашызм – ідэалогія і практыка, упершыню ажыццёўленая на дзяржаўным узроўні ў Італіі ў 1922 г. Безумоўна, гэтая палітычная з'ява не магла прайсці па-за ўвагай у Савецкім Саюзе. У СССР упершыню паняцце „фашызм" у грамадска-палітычнае жыццё ўвёў, „ідэйна" і „ідэалагічна" абгрунтаваў Юзеф Красны (сапраўднае імя – Юзеф Ротштадт) у апублікаваным у „Праўдзе" (друкаваны орган ЦК РКП(б)-ВКП(б)) артыкуле „Польскі фашызм"[2]. У наступным 1923 г. Ю. Красны ўжо больш грунтоўна развіў свае ідэі, выкладзеныя ў „Праўдзе", і апублікаваў невялікую кнігу пад такой жа назвай. У ёй ён зноў паўтарыў сваю выснову аб тым, што

> у апошняй чвэрці 1922 года фашысцкія арганізацыі відавочна і шумна выступілі на арэну палітычнага жыцця ў Польшчы. Непасрэдным штуршком да гэтага несумненна з'явіўся пераварот Мусаліні ў Італіі, выступленні гэтыя прайшлі па ўсіх формах фашысцкай тактыкі[3].

У БССР значна пазней была зроблена спроба асэнсавання гэтай палітычнай з'явы, яе ідэалогіі і практыкі ў беларускім грамадска-палітычным жыцці. Пры тым, гэта з'ява разглядалася не толькі ў БССР, але і ў Заходняй Беларусі (ЗБ). Упершыню (1928 г.) спроба асэнсавання ідэалогіі і практыкі фашызму ў БССР была зроблена ў друкаваным органе цэнтральнага камітэта (ЦК) камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) „Бальшавік Беларусі", у якім быў размешчаны артыкул працаўніка апарата ЦК КП(б)Б М. Канапліна „Фашизм, как

[2] Юз. Красный, *Польский фашизм*, „Правда", 14 декабря 1922 г., с. 2.

[3] Юз. Красный, *Польский фашизм*, Изд-во „Красная новь", Главполитпросвет, Москва 1923.

новейшая форма буржуазной диктатуры", у якім ён прааналізаваў сутнасць фашызму. М. Канаплін адзначыў, што

> фашизм из чисто итальянского явления на протяжении последних лет превратился в проблему международного значения. Это признают сейчас почти все теоретики и политические деятели различных направлений. Это признается и самим вождем мирового фашизма Бенито Муссолини[4].

Далей М. Канаплін адразу пераходзіць ад італьянскага фашызму да Польшчы і адзначае, што

> май и последующие события в Польше принесли с собой окончательное оформление идеологии польского фашизма и дали новый и весьма убедительный пример его практики – фактически государственная власть перешла в руки пана Пилсудского, этого вдохновителя фашизма в Речи-Посполитой[5].

Працягваючы свае разважанні, ён аналізуе праявы фашызму ў Літве, Латвіі, Германіі і Англіі. Аднак усё ж асноўная частка яго артыкула належыць разгляду італьянскага фашызму, які даў моцны штуршок станаўленню фашысцкіх рэжымаў у розных краінах. Звярот М. Канапліна да прыкладу Польшчы не выпадковы, як не выпадкова ўзгадка Ю. Пілсудскага як „кіраўніка польскага фашызму". Польшча ў афіцыйнай савецкай прапагандзе называлася менавіта як „фашысцкая Польшча", „фашысцкая дзяржава", дзе з 1926 г. (майскія падзеі 1926 г.), па словах М. Канапліна, „канчаткова ўсталяваўся фашысцкі рэжым". Заходняя Беларусь, дзе з моманту яе ўваходжання ў склад Польскай дзяржавы ўзнік і пашырыўся беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух і пачала нелегальна дзейнічаць камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ), стала аб'ектам пільнай увагі з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва, ДПУ-АДПУ-НКУС СССР-БССР.

У наступным 4-м нумары „Бальшавіка Беларусі" М. Канаплін зноўку працягвае свае разважанні, аналізуе ідэалогію фашызму і адзначае, што

---

[4] Н. Коноплин, *Фашизм, как новейшая форма буржуазной диктатуры*, „Бальшавік Беларусі" 1928, №3, с. 36.

[5] Ibidem, с. 37.

необходимо отметить, что своей специальной и цельной теории фашизм не имеет и не будет иметь… Он впитал в себя все, что можно было взять у философии эпохи прихода к власти буржуазии, предварительно очистив ее (теорию) от всякой либеральной и демократической скверны и выразил полностью мировоззрение крупного промышленного и финансового капитала. Эту несамостоятельность, разнородность и непостоянство идеологического существа фашизма и скудность ее программы отмечают почти все исследователи[6].

Далей М. Канаплін характарызуе формы фашысцкай улады і адзначае яе неэфектыўнасць у пераадоленні нарастаючых сацыяльна-эканамічных праблем. Разам з тым, ён падкрэслівае, што фашызм як ідэалогія і практыка буржуазнага свету мае патэнцыял для часовага ўтрымання ўлады. На заканчэнні сваіх разважанняў М. Канаплін адзначае, што „фашызм может быть рассматриваем, как новейшая форма и в то же время, как последня фаза буржуазного господства"[7]. Напэўна адна з важнейшых высноў, якую сфармуляваў М. Канаплін, заключалася ў тым, што *„фашизм будет уничтожен не мирным ходом вещей, не путем его собственного внутреннего разложения, а силами пролетарской революции* [выдзелена мною. – А. В.]"[8].

Адзначым, што ў тэзісе М. Канапліна аб знішчэнні фашызму шляхам пралетарскай рэвалюцыі нічога новага няма. Тэарэтыкі марксізму, найперш У. Ленін, разглядалі знішчэнне панавання буржуазіі шляхам рэвалюцыі, а паколькі фашызм быў „последней фазой буржуазного господства", то адсюль лагічна выцякае, што яго знішчэнне можа быць толькі шляхам пралетарскай рэвалюцыі.

У Заходняй Беларусі легальна дзейнічалі шматлікія беларускія палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні і саюзы. За іх дзейнасцю ўважліва сачыла партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР, а таксама АДПУ. Перад выбарамі ў Сейм і Сенат Польшчы (1928 г.) камуністычная ўлада ў Беларусі ахарактарызавала палітычныя беларускія групоўкі ў Заходняй Беларусі. Невядома з якой прычыны першымі вылучылі Беларускі сялянскі саюз (БСС), на чале з былымі пасламі Сейму Фабіянам Ярэмічам і Барысам Рагуляй, які характарызавалі наступным чынам:

[6] Н. Коноплин, *Фашизм, как новейшая форма буржуазной диктатуры*, „Бальшавік Беларусі" 1928, №4, с. 20.

[7] Ibidem, с. 40.

[8] Ibidem, с. 40.

Фактычнае падтрыманне Сельсаюзам фашысцкага ўраду, яго шаленая кампанія супраць СССР і БССР, яго роля як фактычнага саюзніка фашызму ў справе разгрома Грамады (Беларуская сялянска-рабочая грамада) (БСРГ), яго блок з рускімі манархістамі на выбарах у Вільні, яго сувязь с коламі, адкуль вярбуюцца элементы для тэрарыстычных актаў супраць Савецкай улады (Каверда), усе гэта фактычна сцерла мяжу, акая падзялала правадыроў Сельсаюзу ад фашыскай групоўкі Паўлюкевіча[9].

Астатнія групоўкі (Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД) на чале з ксяндзом Адамам Станкевічам, Праваслаўная хрысціянская дэмакратычная партыя (ПХДП), узначальваемая былым сенатарам Багдановічам, паланафільскія групоўкі – Часовая Беларуская Рада (ЧБР) пад кіраўніцтвам Паўлюкевіча, група Умястоўскага-Гурына, якая арганізавалася ў партыю „Беларуская радыкальная партыя" (БРП)) не характарызаваліся як фашысцкія, але атрымалі назву „паланафільскіх", якія падтрымлівалі палітыку польскага ўрада.

Вызначальным у характарыстыцы беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Заходняй Беларусі і БССР стаў 1929 г. У гэтым годзе праблему „беларускага нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-фашызму" ідэалагічна абгрунтаваў вядомы дзеяч заходне-беларускага нацыянальна-вызваленчага руху Леапольд Радзевіч (псеўданім Л. Сталевіч), які ў 1926 г. вярнуўся з Заходняй Беларусі ў БССР. Ён у 1929 г. у друкаваным органе ЦК КП(б)Б „Бальшавік Беларусі" надрукаваў праграмны артыкул „Аб вытоках беларускага нац.-дэмакратызму і нац.-фашызму"[10].

У гэтым жа нумары з'яўляецца артыкул аўтарства вядомага беларускага грамадскага і навуковага дзеяча Сцяпана Некрашэвіча „Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм"[11]. Спынімся больш падрабязна на гэтым артыкуле, які не толькі паўтарае высновы Л. Радзевіча, але больш дакладна фармулюе і вызна-

[9] А. Сянкевіч, *Палітычныя групоўкі ў Заходняй Беларусі перад выбарамі ў Польскі сойм*, „Бальшавік Беларусі" 1928, №1, с. 3.

[10] Гл. падрабязна: А. Сталевіч, *Аб вытоках беларускага нац.-демакратызму і нац.-фашызму*, „Бальшавік Беларусі" 1929, № 10–12, с. 17–32.

[11] А. Некрашэвіч, *Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм*, „Бальшавік Беларусі" 1929, № 10–12, с. 84–90.

чае вытокі беларускага фашызму ў Заходняй Беларусі і беларускага нацдэмакратызму ў БССР. С. Некрашэвіч адразу ж заяўляе аб роўнасці польскага і беларускага фашызму з той разніцай, што

> у сэнсе клясавай нянавісці да Савецкага Саюзу і польскі фашызм, і беларускі нацыянал-фашызм зьяўляюцца сіламі абсолютна роўнымі. Справа толькі ў тым, што колькасна беларускі фашызм ня можа адыгрываць такой выдатнай ролі, якую адыгрывае польскі імпэрыялізм у агульнай сыстэме падрыхтоўкі імпэрыялістаў да нападу на СССР[12].

Далей ён канкрэтна паказвае, хто з'яўляецца лідарам „беларускага нацыянал-фашызму" у Заходняй Беларусі:

> Аналізуючы тыя групоўкі нацыянал-фашыстаў, якія ёсць у апошнія часы на Заходняй Беларусі, патрэбна зазначыць, што найбольш моцнаю, найбольш актыўнаю і найбольш арганізаванаю групоўкаю, якая імкнецца ўжо стварыць і пэўную ідэалогію беларускага нацыянал фашызму, больш-менш аформленаю, зьяўляецца групоўка Луцкевіча-Астроўскага. Ідэйным кіраўніком яе зьяўляецца Луцкевіч, які больш чым хто-небудзь другі падыходзіць да ролі правадыра „беларускага нацыянал-фашызму за кардонам" […] Луцкевіч, першы з усіх нацыянал фашыстаў, імкнецца ў сваіх апошніх працах („За 25 годоў" і „Адбітае жыцьцё") выпрацаваць больш-менш акрэсленую ідэалогію беларускага нацыянал-фашызму. Памянёныя зборнікі маюць ужо пэўныя абрысы нацыянал фашысцкай праграмы і сыстэмы нацыянал-фашысцкай ідэалогіі[13].

Як вынікае, у параўнанні з 1928 г. кардынальна змянілася ацэнка палітычнай сілы ў ЗБ, якую ў савецкай Беларусі характарызавалі як „фашысцкую". Такой „групоўкай" з 1929 г. стала і да моманту роспуску КПЗБ (1938 г.) заставалася „групоўка Луцкевіча-Астроўскага".

Тэзіс аб знішчэнні фашызму, у тым ліку і ў Польшчы, шляхам „пралетарскай рэвалюцыі" стаў ключавым у вызначэнні формы і метадаў барацьбы нацыянальна – вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У рэзалюцыі ЦК КПЗБ аб V з'ездзе КПП адзначалася:

> Арганізацыя рэвалюцыі, скарыстанне і правільная растаноўка асноўных рэвалюцыйных сіл на галоўных і рашаючых частках фронту сацыялістычнай рэвалюцыі ў Польшы – ізаляцыя контрэвалюцыйнага сацыял і нацыянал-фашызму

[12] Ibidem, c. 84.

[13] Ibidem, c. 85.

ад масаў, выкарыстоўванне ва ўмовах паглыбляючагася гаспадарчага і палітычнага крызісу сістэмы фашысцкай дыктатуры ў Польшчы, усіх аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў для абвастрэння і рэвалюцыйнага развязання крызісу – вось асноўныя задачы, якія V з'езд КПП ставіць перад партыяй[14].

Памылковасць і перабольшанне наспявання „рэвалюцыйнай сітуацыі" ў Польшчы прывялі да таго, што V пленум ЦК КПЗБ (1931 г.) адзначыў, што „рэвалюцыйны рух у Польшчы ўваходзіць у новую больш высокую фазу, якая значна прыбліжае наспяванне ўсіх прадпасылак рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы"[15]. Больш таго, „пленум завайстрыў увагу партыі на барацьбе супраць беларускага нацыянал-фашызму", які з'яўляецца „адной з важнейшых апор фашысцкай акупацыі, актыўным правадніком усіх мерапрыемстваў польскага фашызму, адным з важнейшых фактараў у арганізацыі вайны супраць СССР і прыдушэння нацыянальна-вызваленчай барацьбы паняволенага беларускага народу"[16].

V пленум ЦК КПЗБ яшчэ раз падкрэсліў і вызначыў галоўныя палітычныя сілы, якія ахарактарызаваў як „фашысцкія". На пленуме было адзначана: „Усе гэтыя рысы [фашысцкай дыктатуры ў Польшчы. – А. В.], асабліва яскрава выяўляе група Луцкевіча-Астроўскага і іншыя буржуазна-нацыяналістычныя беларускія групоўкі (беларуская хрысціянская дэмакратыя, Сельсаюз і іх агентура, як Беларускі нацыянальны камітэт, Інстытут Беларускай гаспадаркі і культуры) […]"[17].

Тэзіс аб „беларускім нацыянал-дэмакратызме" як неад'емнай і непарыўнай частцы „беларускага нацыянал-фашызму" актыўна падхапіла і пачала выкарыстоўваць КПЗБ. У пастанове ЦК КПЗБ „Аб задачах і тактыцы партыі ў кіраўніцтве сялянскім і нацыянальна-вызваленчым рухам у ЗБ" падкрэслівалася:

Раскрытая ў БССР змова контр-рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія склалі непарыўную частку беларускага нацыя-

[14] *Рэзалюцыя ЦК КПЗБ аб V з'ездзе КПП*, „Бальшавік. Орган ЦК Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі" 1930, № 8, с. 47.

[15] А. Сталевіч, *Напярэдадні баёў за ўладу*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №8–9, с. 16.

[16] Ibidem, с. 19.

[17] *Задачы партыі ў галіне вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў. (Рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №8–9, с. 66.

нал-фашысцкага фронта, і арганізацыйна звязаныя з групай Луцкевіча-Астроўскага, асабліва яскрава выяўляе той факт, што беларускі нацыянал-фашызм з'яўляецца адной з важнейшых апор фашысцкай акупацыі ў ЗБ і актыўным арганізатарам вайны супраць СССР у мэтах паняволення БССР… Гэтая роля беларускага нацыянал-фашызму ўсе шчыльней зрастаючага з польскім фашызмам і ўсе больш непасрэдна кіраванага праз фашыстскую дыктатуру, вынікае с супольных класавых інтэрэсаў беларускай буржуазіі і кулацтва з буржуазіяй пануючай нацыі, дзякуючы агульнай пагрозе іх панавання з боку актыўна нарастаючай рэвалюцыйнай хвалі ў Польшчы і ЗБ, з боку аграмадных поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, у прыватнасці, БССР[18].

Разам з „беларускім нацыянал-фашызмам" у Польшчы, КПЗБ паказвала і выкрывала контрэвалюцыйную ролю „нацыянал-дэмакратызму" у Беларусі. Больш за тое, сцвярджалася, што „польскі нацфашызм" кіруе беларускім нацдэмакратызмам. Адзначалася:

Яркае святло на гэтую ролю беларускага нацыянал-фашызма кідае выкрытая ў БССР контррэвалюцыйная арганізацыя беларускіх нацыянал-дэмакратаў на чале з Ластоўскім, Лесікам і Некрашэвічам, у адносінах якога група Луцкевіча-Астроўскага ў ЗБ з'яўлялася ідэалагічным і арганізацыйным цэнтрам. Нацыянал-дэмакраты імкнуліся арганізаваць кулацкае паўстанне ў БССР і пад кіраўніцтвам польскага фашызму падрыхтоўвалі інтэрвенцыю польскага імперыялізма для звяржэння дыктатуры пралетарыяту ў БССР і пашырэння польскай акупацыі на ўсход. Выбары яшчэ раз падцвердзілі, што беларускі нацыянал-фашызм яшчэ мацней звязаў свой лес з фашысцкай дыктатурай у Польшчы[19].

Падрыхтоўка вайны супраць СССР-БССР непарыўна звязвалася з беларускім нацыянал-фашызмам і іх „агентамі нацдэмамі ў БССР". Адзначым, што спецслужбы Беларусі адсочвалі ўсе публікацыі „нацфашыстаў" і „рэагавалі" на іх у беларускім друку. Так, А. Салагуб адзначаў, што „прыезд былых паслоў Грамады ў БССР – гэта моцны ўдар

[18] *Аб задачах і тактыцы партыі ў кіраўніцтве сялянскім і нацыянальна-вызваленчым рухам у ЗБ" (Пастанова ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №5–6, с. 74.

[19] П. Корчык, *Вынікі фашысцкай выбарчай кампаніі ў Заходняй Беларусі*, „Бальшавік" 1931, №1, с. 7.

па інтэрвенцыянісцкай палітыцы польскага фашызму, удар па лагеры беларускіх нацдэмаў у БССР і нацфашыстаў у Польшчы"[20].

Далей А. Салагуб падкрэсліваў:

> Беларускія нацыянал-фашысты сарвалі канчаткова маскі, выразна сталі ў рады контр-рэвалюцыі і сталі гаварыць на сваей, уласцівай фашызму мове. Гэта вельмі добра, бо масы будуць ведаць, з якім ворагам маюць дачыненне. Яскравым доказам гэтага самараскрыцця і выяўлення своей кулацка-фашысцкай сутнасці з'яўляецца брашура Фабіяна Акінчыца „Чаму гэта так сталася?" (Да справы выезду загранiцу былых правадыроў Грамады) – выданая за грошы дэфензывы па непасрэдным кіраўніцтвам обер-дэфензыўшчыка пана Кіртыкліса, Луцкевіча-Астроўскага. […] Гэта брашура паказвае нам на тую цесную сувязь паміж беларускімі нацдэмамі ў БССР і нацфашыстамі Луцкевічам-Астроўскім в Польшчы, іх імкненні і планы[21].

Ён адзначае, што

> арышт белагвардзейцаў Лесіка, Некрашэвіча, Ластоўскага, Смоліча і іншых актыўных шкоднікаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, беларускія нацыянал-фашысты спаткалі як удар па беларускаму нацыянал-фашызму ў Польшчы. Зусім зразумела. Беларускія нацдэмы ў БССР і беларускія нацыянал-фашысты ў Польшчы – адна сямья[22].

А. Салагуб нагадвае аб шкодніцтве „нацдэмаў", галоўным чынам у Акадэміі навук БССР. Ён адзначае:

> Пачынаючы ад Акадэміі навук беларускія контр-рэвалюцыянеры нацыянал-дэмакраты з відам „вучоных кратоў" займаліся „акадэмічнай", „навуковай" працай, якая носіць выразна шкодніцкі характар. Інакш быць і не магло. Гэта іх адна мэта: як мага шкодзіць у сацыялістычным будаўніцтве, ствараць незадавальненне савецкай уладай у масах і гэтым самым падрыхтоўваць глебу для інтэрвенцыі[23].

---

[20] А. Салагуб, *Разгорнутая праграма беларускага нацыянал-фашызму*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №5–6, с. 4.

[21] Ibidem, с. 5.

[22] Ibidem, с. 7.

[23] Ibidem.

Свой „унёсак" у выкрыццё „беларускага нацыянал-дэмакратызму" і „беларускага нацыянал-фашызму" зрабіў, што вельмі дзіўна, Браніслаў Тарашкевіч, апублікаваўшы ад свайго імя невялічкую брашурку (усяго 20 старонак), прысвечаную гэтай праблеме[24]. Ён, ці хутчэй тыя, хто пісаў ад яго імя, падкрэслілі:

> Беларускі фашызм [у Польшчы. – А. В.], праводзячы ў жыцце інтэрвецыянісцкія планы імперыялістычных дзяржаў, мае арганічную сувязь с беларускімі нацыянал-дэмакратамі ў БССР. Радство, калі не аналагічнасць буржуазна-кулацкай ідэалогіі нацыянал-фашыстаў і нацдэмаў не прыходзіцца даказваць. Характар „дзейнасці" адных і другіх паказвае не толькі на іх арганічную, але і на ідэйную сувязь. Іх звязвае як контррэвалюцыйнае мінулае, так і контррэвалюцыйнае сучаснае[25].

Вярнемся да артыкула С. Некрашэвіча, ці дакладней да той яго часткі, якая прысвечана беларускаму „нацыянал-дэмакратызму" у БССР. У адрозненне ад Л. Радзевіча, які абгрунтоўвае вытокі „нацдэмакратызму" ад Беларускай сацыялістычнай Грамады (БСГ), „Нашай Нівы" і Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), С. Некрашэвіч, не ўдаючыся ў тэарэтычныя разважанні, вельмі лапідарна і коратка зводзіць свае высновы да некалькіх пунктаў. На яго думку, вытокі беларускага „нацыянал-дэмакратызму" зводзяцца да наступнага:

а) Адмаўленьне наяўнасці клясавае дыферэнцыяцыі на вёсцы, разважанні аб адзіным беларускім фронце;
б) Беларусь мае спэцыфічныя беларускія ўмовы, якія настолькі адрозніваюць яе ад іншых раёнаў Савецкага Саюзу, што і агульная палітыка партыі і савецкай ўлады тут не падыходзіць (калектывізацыя, вылучэнне пролетарскіх кадраў і інш.);
в) Адмаўленьне існавання беларускай буржуазіі;
г) Прыпісванне нязначнай ролі дробна-буржуазным партыям у справе стварэньня Комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і БССР;
д) Ацэнка палітыкі партыі, у прыватнасьці ў справе культурнага будаўніцтва, як палітыкі, якая амаль цалкам працягвае адраджэнчую палітыку. Гэта зна-

[24] Б. Тарашкевіч, *Заходняя Беларусь – плацдарм імперыялістычанай інтэрвенцыі*, Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі пры БелАН, Минск 1931.

[25] Ibidem, c. 20.

чыць, што пралетарыят, які ўзяў уладу, узяў на сябе і ролю працягваньня тых традыцый, якія былі ў пэрыяд адраджэньня.

[…] Такім чынам, калі прасачыць сутнасць нацыянал дэмократычнай ідэалогіі ў нас [БССР – А. В.] і параўнаць яе з сутнасцю нацыянал-фашысцкай ідэалогіі за кардонам [у Заходняй Беларусі – А. В.], мы пабачым, што тут па цэламу шэрагу пытаньняў адбываецца змыканьне, пераклічка паміж нацыянал-фашыстамі за кардонам і нацыянал-дэмократамі ў нас. А гэта аб'ектыўна прыводзіць толькі да таго, што гэта ўзмацняе позыцыі польскага фашызму, бо ўзмацненне позыцый беларускага нацыянал-фашызму ёсць узмацненне позіцый польскага нацыянал-фашызму, узмацненне польскага фашызму ў справе падрыхтоўкі нападу на СССР[26].

Заўважым, што і Л. Радзевіч, і С. Некрашэвіч не „убачылі" аднаго вельмі важнага і ключавога тэзіса, які стаў адным з вызначальных у грамадска-палітычным жыцці Савецкага Саюза і БССР. Яны не ўбачылі, не асэнсавалі і не зразумелі ключавога тэзіса І. Сталіна аб „абвастрэнні класавай барацьбы, па меры пабудовы сацыялізму ў СССР" і „абвастрэнні асноўнай супярэчнасці паміж капіталістычным светам і СССР". Гэтыя тэзісы, асабліва першы, сталі вызначальнымі ў развязванні тэрору ўнутры Савецкага Саюза напрыканцы 1920-х – у сярэдзіне 1930-х гг., фабрыкацыі АДПУ СССР-БССР розных спраў супраць „правых", „трацкістаў", „шкоднікаў" у сельскай гаспадарцы і прамысловасці, у тым ліку і супраць беларускіх „нацдэмаў" у БССР. „Нацыянал-фашысты" у Заходняй Беларусі, зразумела, былі недасягальныя для беларускага АДПУ, таму галоўнай формай барацьбы супраць іх сталі агітацыйна-прапагандысцкія кампаніі, а таксама іх „выкрыццё" і шэльмаванне ў перыядычным друку і нешматлікіх прапагандысцкіх кнігах, выдаваемых галоўным чынам для партыйна-савецкіх адказных работнікаў. „Нацыянальныя дэмакраты (нацдэмы)" былі абсалютна безабароннымі, не маглі нікуды дзецца з савецкай Беларусі і таму сталі галоўнымі ворагамі і лёгкай ахвярай беларускага ДПУ-АДПУ.

Што дзіўна, ні Л. Радзевіч, ні С. Некрашэвіч у сваіх працах не выкарысталі і не „падвялі" гэты тэзіс пад свае высновы, што стала іх фатальнай памылкай. Гэта зрабіў за іх ЦК КП(б)Б і яго падначалены

[26] А. Некрашэвіч, *Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм*, „Бальшавік Беларусі" 1929, № 10–12, с. 88.

ЦК КПЗБ. У гэтым жа самым нумары (вось іронія лёсу) ЦК КПЗБ адзначыў:

> Найбольш поўны выраз гэтыя памылкі атрымалі ў артыкулах т. Сталевіча, які пад уплывам крытыкі ЦК КПЗБ прызнаў памылковасьць і шкоднасьць развітых у сваіх артыкулах у „Полымя" і ў артыкуле „Сялянскія партыі ў ЗБ", зьмешчанага ў „Бальшавіку Беларусі", нацыянал-апартуністычных канцэпцыяў, хоць і не адразу поўнасцю ўсьвядоміў карэнні гэтых памылак[27].

Л. Сталевіч адразу схамянуў, якая нябеспека наступіла для яго асабіста і звярнуўся з публічным зваротам у адрас III Пленума ЦК КПЗБ з „слёзніцай" – пакаянным лістом за дапушчаныя памылкі. Ён прызнаў:

> Заяўляю, што я цалком і поўнасцю прызнаю крытыку, дадзеную ЦК КПЗБ і III пленумам ЦК КПЗБ маіх нацыянал-апартуністычных памылак, якія заключаюцца ў няпрызнаньні існаваньня беларускай буржуазіі і неправідловым разважанні аб варунках дасягнення роўнапраўнасьці беларускага кулака ў лагеры польскага фашызму, недаацэнцы небяспекі росту беларускага буржуазнага нацыяналізму, канцэпцыі аб самабытным разьвіцці рэвалюцыйнага руху ў ЗБ, што прыводзіла да недаацэнкі ролі пралетарыяту, як гегемона рэвалюцыйнага руху, а так-жа недастатковага разумення крыніц узнікненьня КПЗБ. Прызнаючы гэтыя памылкі, я не адразу поўнасьцю ўсвядоміў карэньні гэтых памылак, якія ляжаць галоўным чынам у нявыжытых да астатку перажыткаў нацыяналістычнага адражэнцкага руху. Погляды былі тым больш небяспечныя ў сучасных варунках ЗБ, бо затруднялі барацьбу з узрастаючай небяспекай хістаньняў у шэрагах нацыянал-вызваленчага руху пад націскам нацыянал-фашызму ў ЗБ і нацыянал-дэмократызму ў БССР, а гэта зьяўляецца асабліва пагражаючым пры ўсё ўзрастаючай небяспецы нападу польскага фашызму на СССР[28].

Аднак гэтыя пакаянныя прызнанні не дапамаглі ні Л. Сталевічу, ні С. Некрашэвічу. У 1930 г. АДПУ БССР сфальсіфікаваў першую маштабную справу „Саюза вызвалення Беларусі (СВБ)", паводле якой

---

[27] *Пастановы III пленуму ЦК КПЗБ. Матэрыялы і дакументы*, „Бальшавік Беларусі" 1929, №10–12, с. 98.

[28] Ibidem, c. 104.

было арыштавана 108 чалавек, у тым ліку і Сцяпан Некрашэвіч[29]. Усе абвінавачаные былі

> осуждены за то, что они являлись членами контрреволюционной националистической организации „Саюз адраджэння Белоруссии" (САБ), впоследствии переименованной в „Саюз Вызваленя Беларусі", созданной и руководимой членами эмигрантского националистического правительства, так называемой „Белорусской Народной Республики", во главе с премьер-министром „правительства" Ластовским, возвратившим в БССР из-за границы […] Основной и конечной задачей „САБ-СВБ" являлась задача свержения в Белоруссии советской власти и создание в так называемой „независимой Белоруссии" капиталистической системы хозяйствования[30].

Паводле пастановы Калегіі АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 г. абвінавачаныя, у тым ліку і С. Некрашэвіч, былі асуджаны да розных тэрмінаў пакарання ў папраўча-працоўных лагерах (ППЛ)[31]. 11 лістапада 1957 г. Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда БССР заявіла пратэст супраць справы АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 г. і ўсе абвінавачаныя па гэтай справе былі рэабілітаваныя[32]. Адзначым, што АДПУ сфальсіфікавала справу СВБ аж на 29 тамах[33], якія зараз знаходзяцца ў архіве КДБ РБ і, зразумела, недасягальныя для даследчыкаў.

Справа „СВБ" мела для беларускай творчай інтэлігенцыі фатальныя наступствы, бо толькі яе вынікам стаў арышт 90 чалавек, былі асуджаны на розныя тэрміны зняволення[34]. Гэтая наскрозь сфальсіфікаваная справа стала першай масавай атакай супраць беларускай

---

[29] Н. Васілеўская, *Масавыя рэпрэсіі інтэлігенцыі. Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст.* [у:] *Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 лютага 1896 г.)*, Мінск 1998, с. 16.

[30] Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф. 188, воп. 3, спр. 294, т. 5, л. 251 об. *Определение Верховного Суда БССР по уголовным делам, рассмотренным в порядке надзора и материалы к ним.*

[31] Ibidem, л. 253.

[32] Ibidem, л. 250.

[33] Ibidem, л. 251.

[34] Н. Васілеўская, op. cit., с.16.

творчай інтэлігенцыі і залажыла падмурак для наступных сфальсіфікаваных рэпрэсіўных акцый АДПУ БССР супраць нацыянальна арыентаванай часткі беларускай інтэлігенцыі.

Наступны этап абвінавачванняў дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі наступіў у 1934 г. і гэта было звязана са сфальсіфікаваным працэсам „Беларускага нацыянальнага цэнтра" (БНЦ). Як ні дзіўна, актыўна далучыўся да гэтай справы Павел Корчык – першы сакратар ЦК КПЗБ. У друкаваным органе ЦК КП(б)Б „Бальшавік Беларусі" ён надрукаваў вялікі артыкул, у якім адзначыў:

> Выкрыцце ў БССР контрэвалюцыйнай нацыяналістычнай беларускай арганізацыі, на чале якой стаялі былыя дзеячы „Грамады" і „Змагання" – Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Дварчанін, Гаўрылюк і іншыя, а таксама дэмаскаванне агентаў польскай дэфензывы і беларускага нацыянал-фашызму ў верхавіне ТБШ нанеслі жорсткі ўдар махінацыям беларускага нацыянал-фашызму і польскага імперыялізму[35].

Узгадаўшы вышэйпамянёных дзеячаў заходне-беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, П. Корчык абвінаваціў іх у тым, што „гніла-ліберальныя адносіны да заядлых беларускіх контр-рэвалюцыянераў, якія перафарбаваліся ў рэвалюцыянераў", дапамаглі гэтым „Луцкевічам, Астроўскім, Рак-Міхайлоўскім, Дварчаніным, Бурсевічам і іншым пасрэдна, ці беспасрэдна захапіць у свае рукі рад камандных вышынь у арганізацыях нацыянальна-вызваленчага руху"[36]. Важна адзначыць, што П. Корчык спасылаецца на „дапамогу брацкай КП(б)Б" у барацьбе супраць нацдэмцаў, „якая пад бальшавіцкім кіраўніцтвам свайго ЦК праводзіла і праводзіць бязлітасную барацьбу з нацыянал-ухілістамі, контр-рэвалюцыйнай нацдэмаўшчынай, выяўляючы і дэмаскуючы нацыянал-фашысцкіх агентаў, якія пралазяць з Заходняй Беларусі ў БССР"[37].

Адзначым, што ў барацьбе з „нацдэмакратызмам" і „нацыянал-фашызмам" вядучая роля належала кампартыі Беларусі. У 1933 г.

---

[35] П. Корчык, *Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына „Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі"*, „Бальшавік Беларусі" 1934, № 7, с. 35.

[36] Ibidem, c. 41.

[37] Ibidem, c. 43.

„Бальшавік Беларусі" падвёў вынік „бязлітаснай барацьбе ЦК КП(б)Б" з „нацдэмамі", заявіўшы, што „летам 1933 г. контрэвалюцыйная арганізацыя нацдэмаў – "Беларускі нацыянальны цэнтр" – была выкрыта адначасова з "Украінскім нацыянальным цэнтрам". Нацдэмаўскія дзеячы і шпікі з БНЦ былі арыштаваныя. Снежаньскі пленум ЦК і ЦКК нанес новы, рашучы ўдар на нацэмаўскай дзейнасці на новым этапе"[38].

ЦК КПЗБ па выніках справы БНЦ прыняў спецыяльную рэзалюцыю „Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі"[39]. У рэзалюцыі адзначалася:

> Выкрыцце беларускай контррэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай арганізацыі ў БССР, на чале якой стаялі Дварчанін, Рак-Міхайлоўскі, Гаўрылік і іншыя, выявіла, што яна працавала, як у БССР, гэтак і ў Заходняй Беларусі і кіравалася адзіным палітычным контррэвалюцыйным цэнтрам у Вільні з Луцкевічам, Астроўскім, ксяндзом Станкевічам на чале. Дэмаскаванне і разгром гэтай арганізацыі, якая знаходзілася пад непасрэдным караўніцтвам 2-га аддзела генеральнага штаба і ў цесным кантакце з украінскай буржуазіяй, з'яўляецца перамогаю рабочага класа і працоўных мас Савецкага Саюза і нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. […] Здэмаскаванне гэтых контр-рэвалюцыйных агентур па ободвух баках граніцы, дало магчымасць партыі выявіць метады работы класавага ворага, які пранікаў у КПЗБ дзеля таго, каб раскласці с сярэдзіны рэвалюцыйны рух і нанесці яму здрадніцкі ўдар у спіну ў момант рашаючых рэвалюцыйных баёў, або вайны проціў СССР. Выкрыццё гэтых агентур завастрыла ўвагу партыі на барацьбе проціў беларускага нацыянал-фашызму, як на неабходным варунку узмацнення барацьбы супраць польскай акупацыі, а таксама мабілізівала партыю на ўзмацненне барацьбы супраць нацыянал-апартуністычных памылак і хістанняў, супраць усялякай няустойлівасці, за бальшавіцкую пільнасць[40].

Палітычныя абвінавачанні ў „беларускім нац.-дэмакратызме і беларускім нац.-фашызме", „сувязях з польскім фашызмам" сталі асноўным абвінавачаннем супраць беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў з Заходняй Беларусі, якія паддаліся на савецкую „прыманку", прыеха-

---

[38] П. Кірушы, *Контррэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм на службе інтэрвенцыі*, „Бальшавік Беларусі" 1935, №1–2, с. 122.

[39] *Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (Рэзалюцыя ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік" 1934, №1, с. 41.

[40] Ibidem, с. 41.

лі ў камуністычную Беларусь напрыканцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. Праз нядоўгі час яны былі арыштаваныя па сфальсіфікаваных справах, сасланыя ў лагеры ці расстраляныя. Красамоўным сведчаннем служаць лёсы Леона Бабровіча, Сымона Рак-Міхайлоўскага, Пятра Мятлы, Іосіфа Гаўрыліка, Максіма Бурсевіча, Флягонта Валынца, Паўла Валошына, Ігната Дварчаніна, Сяргея Барана, Пятра Гарбацевіча (Клінцевіча) і ўжо ўзгаданага Леапольда Радзевіча (Сталевіча) ды іншых. Калегіяй АДПУ БССР ад 9 студзеня 1934 г. і 19 мая 1934 г. яны абвінавачваліся ў стварэнні і актыўнай дзейнасці так званага „Беларускага нацыянальнага цэнтра"(БНЦ), а таксама ў тым, што

> на тэрыторыі Заходняй Беларусі па заданні польскай выведкі займаліся падрыўной работай супраць рэвалюцыйных арганізацый, стваралі нацыяналістычныя арганізацыі, якія ставілі сваей мэтай адарванне БССР ад Савецкага Саюза і стварэнне буржуазнай беларускай рэспублікі, выкарыстоўвалі гэтыя арганізацыі для засылкі на тэрыторыю СССР нацыяналістычных і шпіёнскіх кадраў у мэтах контр-рэвалюцыйнай дзейнасці, а потым самі былі закінутыя на тэрыторыю БССР, дзе стварылі з гэтых кадраў контр-рэвалюцыйную арганізацыю „Беларускі Нацыянальны Цэнтр" (БНЦ), кіравалі гэтай арганізацыяй, вербавалі ў яе новых членаў, стваралі ячэйкі і дыверсійныя групы на месцах, займаліся шпіянажам на карысць польскай разведкі[41].

Паводле гэтага прысуду Л. Бабровіч быў прыгавораны да расстрэлу, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, І. Гаўрылік, І. Дварчанін, М. Бурсевіч, Ф. Валынец, П. Валошын – прыгавораны да расстрэлу с заменай да 10 год выпраўча-працоўных лагераў (ВПЛ), С. Баран – да 10 год ВПЛ, А. Радзевіч (Сталевіч), П. Гарбацевіч (Клінцевіч) – да 5 год ВПЛ. Да гэтых вязняў вярнуліся ў 1937 г., калі пастановай Тройкі Упраўлення наркамата унутраных спраў (УНУС) па Ленінградскай вобласці ад 9 кастрычніка 1937 г. М. Бурсевіч, П. Валошын, Ф. Валынец былі прагавораны да расстрэлу. Не надоўга іх перажылі І. Гаўрылік і І. Дварчанін, якія паводле пастановы гэтай жа Тройкі 25 лістапада 1937 г. таксама былі расстраляныя[42].

---

[41] Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф. 188, оп. 3, д. 272, л. 153. *Определения судебной коллегии по уголовным делам Верховного Суда БССР и областных судов и материалы к ним*, т. 3, 7.08.1956 – 3.10.1956 гг.

[42] Ibidem, лл. 146–147.

Працягам тэмы „беларускага нацыянал-фашызму" стала брашура Я. Доўгага[43] аб „беларускім нацыянал-фашызме ў Латвіі", у якой была каротка ахарактарызавана гісторыя „беларускай контррэвалюцыйнай эміграцыі" у Латвіі, паказана яе арганізацыйная структура, ахарактарызавана „навуковая і царкоўная палітыка беларускіх нацыянал-фашыстаў у Латвіі" і раскрыты іх антысавецкія планы[44]. Фактычна гэта была апошняя брашура, прысвечаная дзейнасці „беларускіх нацыянал-фашыстаў", якая выйшла пад грыфам Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Беларускай акадэміі навук.

М. Ракіта ў 1934 г. надрукаваў брашуру аб „беларускім нацыянал-фашызме", у якой адзначыў, што

> з цемных закуткоў дэфензывы і 2-га аддзелу генеральнага штабу ніткі гэтай кампаніі [супроць БССР. – А. В.] вядуць з аднаго боку да рэдакцыі газеты „Слова", галоўнага органу ў Заходняй Беларусі польскіх абшарнікаў і ўрадавай фашысцкай санацыі. З благаслаўлення фашыстаў-акупантаў антысавецкае цкаванне гэтым разам мае намер быць „нацыянальнай беларускай кампаніяй" пад лозунгам „вызвалення беларускага народу з пад бальшавіцкага ярма". Дык вось жа, Луцкевічы, Астроўскія, Станкевічы, Акінчыцы пруцца зноў на сцэну. Пруцца, як абаронцы, прадстаўнікі і правадыры беларускага народу[45].

Фактычна гэта нізкапробная агітацыйна-прапагандыская брашура (61 старонка), разлічаная на неадукаваныя масы беларускага насельніцтва і пабудаваная на супрацьлеглых проціпастаўленнях: „у СССР-БССР – росквіт, дабрабыт, заможнае жыцце і росквіт беларускай культуры", „у Польшчы – терор, заняпад, галеча, нацыянальнае безпраўе", „беларускія нацыянал-фашысты – Луцкевіч, Акінчыц, Астроўскі і іншыя – памагатыя польскага фашызму, які усебакова прыгнятае беларускі і ўкраінскі народы".

Заўважым, што напрыканцы 1950-х гг. абвінавачанні беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў у „нацыянал-фашызме" былі ціха,

---

[43] Я. Доўгі, *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Выдавецтва БелАН, Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, Мінск, 1933.

[44] Ibidem, c. 48.

[45] М. Ракіта, *Адказ беларускі нацыянал-фашыстам. Праўда аб СССР і праўда аб тым, хто нацкоўвае на СССР*, Вільня 1934, с. 5.

без афішавання зняты і не выкарыстоўваліся ў грамадска-палітычнай і гістарычнай літаратуры. Аднак тэрмін „беларускія буржуазныя нацдэмы" так і застаўся аж да канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. Так, у „Учебном материале" „Белорусские буржуазные националисты", выдадзеным КДБ пры СМ СССР у 1957 г. пад грыфам „Зусім сакрэтна", сцверджалася, што

> для руководства антисоветской деятельностью на территории БССР, вскоре после бегства ряда главарей белорусского национализма, в Польше был создан ими при содействии польской разведки нелегальный центр – „Союз вызволеня Белоруссии". По решению этого центра ряд националистов пробрался в Советскую Белоруссию для создания антисоветских повстанческих организаций. Их базой явилось националистическое подполье, оставшееся на советской территории после изгнания германских и польских оккупантов. В 1926 г. на территории БССР националисты создали антисоветскую повстанческую организацию с центром в Минске, также получившую название „Союз вызволения Белоруссии" (СВБ). Она имела филиалы в Витебске, Полоцке и других городах Белорусской ССР. […] Установлено, что программа этого вражеского подполья была направлена на ликвидацию завоеваний Октябрьской социалистической революции и восстановления в республике власти помещиков и капиталистов. „Союз вызволения Белоруссии" ликвидирован ОГПУ в 1930 г. По делу арестовано большое количество националистов. В августе 1933 г. органы государственной безопасности вскрыли широко разветвленную антисоветскую повстанческую организацию, известную под названием „Белорусский национальный центр" (БНЦ), которая распространяла свою деятельность на значительную часть территории БССР и имела филиалы в Москве и Ленинграде. „Белорусский национальный центр" создала агентура 2-го отдела (разведка) польского генерального штаба, который руководил этим центром через сотрудников польского посольства в Минске и генерального консульства в Минске. Ликвидацией „Белорусского национального центра" была сорвана еще одна попытка империалистических государств, в частности панской Польши, свергнуть советскую власть в Белоруссии[46].

Нават пры павярхоўным аналізе гэтага тэксту адразу бачна, што ён, выкажу меркаванне, без значных змен быў узяты з сфальсіфікаваных

[46] *Белорусские буржуазные националисты. Учебный материал*, Комитет государственной безопасности при Совете Министров СССР, Высшая школа, Москва 1957, с. 14.

спраў АДПУ БССР у 1930 і 1933 гг. супраць нацыянальнай творчай інтэлігенцыі. Паўтару, што па справе „СВБ" 11 лістапада 1957 г. Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага Суда БССР заявіла пратэст супраць справы АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 г. і прызнала яе неабгрунтаванай і незаконнай. КДБ СССР не мог не ведаць аб справе рэабілітацыі і рашэнні ВС Суда БССР па гэтай справе і, тым не менш, выдае такі „Учебный материал" у гэтым жа годзе.

У сярэдзіне 1960-х гг. адыёзныя абвінавачанні беларускіх дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Заходняй Беларусі і ў БССР у „нацыянал-фашызме" былі зняты, а фальшывыя сцверджанні аб „беларускім нацыянал-дэмакратызме" працягвалі існаваць у беларускай савецкай гістарыяграфіі да канца 1980-х – пачатку 1990-х гг.[47], калі канчаткова былі зняты абвінавачванні ў „нацыянал-дэмакратызме" як не маючыя ніякага навуковага абгрунтавання. Разам з тым, да цяперашняга часу ў сучаснай нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі няма асобнай працы ці прац, прысвечаных глыбокаму і ўсебаковаму аналізу вытокаў і зместу „тэорыі" „беларускага нацыянал-дэмакратызму" і „беларускага нацыянал-фашызму", як у Заходняй Беларусі, так і ў БССР.

Archival sources

Nacional′nyj arhiv Respubliki Belarus′ (NARB), f. 188, op. 3, d. 272, l. 153. *Opredeleniâ sudebnoj kollegii po ugolovnym delam Verhovnogo Suda BSSRI oblastnyh sudov i materialy k nim*, t. 3, 7.08.1956 – 3.10.1956 gg. [Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф. 188, оп. 3, д. 272, л. 153. *Определения судебной коллегии по уголовным делам Верховного Суда БССР и областных судов и материалы к ним*, т. 3, 7.08.1956 – 3.10.1956 гг.].

Nacional′nyj arhiv Respubliki Belarus′ (NARB), f. 188, vop. 3, spr. 294, t. 5, l. 251 ob. *Opredelenie Verhovnogo Suda BSSR po ugolovnym delam, rassmotrennym v porâdke nadzora i materialy k nim* [Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф. 188, воп. 3, спр. 294, т. 5, л. 251 об. *Определение Верховного Суда БССР по уголовным делам, рассмотренным в порядке надзора и материалы к ним*].

[47] А. Савіч, *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы. Манаграфія*, навук. рэд. А. Каваленя, Брэсц. Дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, Брэст 2012, с. 204.

References

Ab asnoŭnyh krynìcah nacyânal-apartunìzmu ŭ Kamunìstyčnaj partyì Zahodnâj Belarusì (Rèzalûcyâ CK KPZB), „Bal'šavìk" 1934, №1, s. 41–45 [*Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (Рэзалюцыя ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік" 1934, №1, с. 41–45].

Ab zadačah ì taktycy partyì ŭ kìraŭnìctve sâlânskìm ì nacyânal'na-vyzvalenčym ruham u ZB (Pastanova CK KPZB), „Bal'šavìk Belarusì" 1931, №5–6, s. 74–82 [*Аб задачах і тактыцы партыі ў кіраўніцтве сялянскім і нацыянальна-вызваленчым рухам у ЗБ (Пастанова ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №5–6, с. 74–82].

Belorusskie buržuaznye nacionalisty. Učebnyj material, Komitet gosudarstvennoj bezopasnosti pri Sovete Ministrov SSSR, Vyssšaâ škola, Moskva 1957 [*Белорусские буржуазные националисты. Учебный материал*, Комитет государственной безопасности при Совете Министров СССР, Высшая школа, Москва 1957].

Vasìleŭskaâ N., *Masavyâ rèprèsìì ìntèlìgencyì. Palìtyčnyâ rèprèsìì na Belarusì ŭ XX st. Matèryâly navukova-praktyčnaj kanferèncyì (Mìnsk, 27–28 lûtaga 1996 g.)*, Mìnsk 1998, s. 14–24 [Васілеўская Н., *Масавыя рэпрэсіі інтэлігенцыі. Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX ст. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 лютага 1996 г.)*, Мінск 1998, с. 14–24].

Doŭgì Â., *Belaruskì nacyânal-fašyzm u Latvìì*, Vydavectva Belan, Kamìsìâ pa vyvučènnû Zahodnâj Belarusì, Mìnsk 1933 [Доўгі Я., *Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі*, Выдавецтва БелАН, Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, Мінск 1933].

Zadačy partyì ŭ galìne vyzvalenčaj barac'by prygnečanyh narodaŭ. (Rèzalûcyâ V plenuma CK KPZB), „Bal'šavìk Belarusì" 1931, №8–9, s. 64–73 [*Задачы партыі ў галіне вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў. (Рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ)*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №8–9, с. 64–73].

Kìrušy P., *Kontrrèvalûcyjny belaruskì nacyânal-dèmakratyzm na službe ìntèrvencyì*, „Bal'šavìk Belarusì" 1935, №1–2, s. 99–122 [Кірушы П., *Контррэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм на службе інтэрвенцыі*, „Бальшавік Беларусі" 1935, №1–2, с. 99–122].

Konoplin N., *Fašizm, kak novejšaâ forma buržuaznoj diktatury*, „Bal'šavìk Belarusì" 1928, №3, s. 36–49 [Коноплин Н., *Фашизм, как новейшая форма буржуазной диктатуры*, „Бальшавік Беларусі" 1928, №3, с. 36–49].

Korčyk P., *Vynìkì fašysckaj vybarčaj kampanìì ŭ Zahodnâj Belarusì*, „Bal'šavìk" 1931, №1, s. 1–11 [Корчык П., *Вынікі фашысцкай выбарчай кампаніі ў Заходняй Беларусі*, „Бальшавік" 1931, №1, с. 1–11].

Nekrašèvìč A., *Belaruskì nacyânal-fašyzm ì âgo sabrat belaruskì nacyânal-dèmakratyzm*, „Bal'šavìk Belarusì" 1929, №10–12, s. 83–90 [Некрашэвіч А., *Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм*, „Бальшавік Беларусі" 1929, №10–12, с. 83–90].

Pastanovy III plenumu CK KPZB. Matèryâly ì dakumenty, „Bal'šavìk Belarusì" 1929, №10–12, s. 98 [*Пастановы III пленуму ЦК КПЗБ. Матэрыялы і дакументы*, „Бальшавік Беларусі" 1929, №10–12, с. 98].

Rakìta M., *Adkaz belaruskìm nacyânal-fašystam. Praŭda ab SSSR ì praŭda ab tym, hto nackoŭvae na SSSR*, Vìl'nâ 1934 [Ракіта М., *Адказ беларускім нацыянал-фашыстам. Праўда аб СССР і праўда аб тым, хто нацкоўвае на СССР*, Вільня 1934].

Rèzalûcyâ CK KPZB ab V z`ezdze KPP, „Bal'šavìk. Organ CK Kamunìstyčnaj partyì Zahodnâj Belarusì" 1930, №8, s. 41–47 [*Рэзалюцыя ЦК КПЗБ аб V з'ездзе КПП*, „Бальшавік. Орган ЦК Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі" 1930, №8, с. 41–47].

Savìč A., *Nacyânal'na-vyzvalenčy ruh u Zahodnâj Belarusì (1921–1939 gady): gìstaryâgrafìâ prablemy. Managrafìâ*, navuk. rèd. A. Kavalenâ, Dzârž. un-t ìmâ A. S. Puškìna, Brèsc 2012 [Савіч А., *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы. Манаграфія*, навук. рэд. А. Каваленя, Дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна, Брэсц 2012].

Salagub A., *Razgornutaâ pragrama belaruskaga nacyânal-fašyzmu*, „Bal'šavìk Belarusì" 1931, №5–6, s. 4–8 [Салагуб А., *Разгорнутая праграма беларускага нацыянал-фашызму*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №5–6, с. 4–8].

Stalevìč A., *Napârèdadnì baëŭ za ŭladu*, „Bal'šavìk Belarusì" 1931, №8–9, s. 14–19 [Сталевіч А., *Напярэдадні баёў за ўладу*, „Бальшавік Беларусі" 1931, №8–9, с. 14–19].

Sânkevìč A., *Palìtyčnyâ grupoŭkì ŭ Zahodnâj Belarusì perad vybaramì ŭ Pol'skì sojm*, „Bal'šavìk Belarusì" 1928, №1, s. 16–19 [Сянкевіч А., *Палітнычыя групоўкі ў Заходняй Беларусі перад выбарамі ў Польскі сойм*, „Бальшавік Беларусі" 1928, №1, с. 16–19].

Taraškevìč B., *Zahodnââ Belarus' – placdarm ìmperyâlìstyčnaj ìntèrvencyì*, Kamìsìâ pa vyvučènnû Zahodnâj Belarusì pry BelAN, Minsk 1931 [Тарашкевіч Б., *Заходняя Беларусь – плацдарм імперыялістычнай інтэрвенцыі*, Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі пры БелАН, Минск 1931].

Krasnyj Ûz., *Pol'skij fašizm*, „Pravda", 14 dekabrâ 1922 g., s. 2–3 [Красный Юз., *Польский фашизм*, „Правда", 14 декабря 1922 г., с. 2–3].

Krasnyj Ûz., *Pol'skij fašizm*, Izd-vo „Krasnaâ nov'", Glavpolitprosvet Moskva 1923 [Красный Юз., *Польский фашизм*, Изд-во „Красная новь", Главполитпросвет, Москва 1923].